*Э. К. ДАРАШЭВІЧ*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ФАЛЬКЛОРУ Ў ФАРМІРАВАННІ СВЕТАПОГЛЯДУ СУБ'ЕКТА КУЛЬТУРЫ

*Сёння тэарэтыкі культуры пры фарміраванні адукацыйнай мадэлі пэўнай краіны абгрунтоўваюць неабходнасць яе злучэння з традыцыйнай культурай народа. Аўтар артыкула падкрэслівае важнасць выкарыстання фальклору ў выхаванні гарманічнай асобы.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У XXI ст. тэарэтыкі культуры пры фарміраванні адукацыйных мадэляў кожнай краіны абгрунтоўваюць неабходнасць іх злучэння з традыцыйнай культурай народа. Спецыялісты ў галіне камунікацыі падлічылі, што прыкладна да 80% жыццёва важнай светапогляднай інфармацыі чалавек атрымлівае ў дашкольным узросце. Інфармацыя ў гэты перыяд перадаецца выключна вусным шляхам, асацыятыўна і эмацыянальна афарбавана і ў пэўнай ступені з'яўляецца архетыпічнай. Механізмы набыцця першаснага глыбокакарэннага светапогляду амаль ідэнтычны і ў традыцыйным, і ў індустрыяльным асяроддзі, паколькі аперыруюць такімі паняццямі, як маці, бацька, сябар, свае, чужынцы, радасць, боль, неба, хата, я, іншы чалавек, разам, паасобку і г.д.

Натуральна, што ў традыцыйным грамадстве асноўныя сродкі фарміравання светапогляду – гульня, праца, абрад, матчына мова, песня, казка і г.д. Як сцвярджаюць аналітыкі, «на Беларусі да з'яўлення пісьменнасці першасныя элементы асветы базіраваліся на канонах і ведах народнай педагогікі. Яны былі арганічнай часткай усяго жыцця грамадства, найбольш праяўляліся ў працоўным навучанні» [4, с. 204]. Традыцыйная культура як светапоглядна-выхаваўчы комплекс паспяхова і этнаэкалагічна перадавалася вусным шляхам «з пакалення ў пакаленне». Таму роля традыцыйных ведаў кожнай этнічнай супольнасці, якія багата прадстаўлены ў фальклорных жанрах, сапраўды выключная.

Аўтэнтычны (існуючы ў натуральным вясковым асяроддзі) фальклор беларусаў найбольш «завязаны» на этнаэкалагічных тэмах – родная зямля, працэс вегетацыі аграрных культур, супольны грамадскі побыт, сімвалічна адлюстраваных у касмалагічных уяўленнях. Значэнне яго ў выхаванні і сёння адмысловае. У далучэнні дзіцяці да культурнай спадчыны мастацтва вуснай традыцыі адыгрывае асаблівую ролю. На працягу тысячагоддзяў фальклор паўстае як духоўна-маральнае і эмацыянальнае поле, на якім гадаваліся дзіцячыя душы шматлікіх пакаленняў беларусаў і іх этнасаўпродкаў. Сувязь міфалогіі і найважнейшых формаў фальклору выяўлялася як у мастацка-сюжэтных лініях моўных жанраў, так і ў полімастацкім сінкрэтызме старэйшых за гаворкі абрадаў. Яна фарміравала вобразны шэраг чароўных казак, балад, абрадавых песень, гульняў і танцаў, змест якіх пабудаваны на традыцыйнай аксіялогіі – гуманістычных і этнаэкалагічных каштоўнасцях. Будаўнічым матэрыялам гэтых вобразаў была перш за ўсё родная мова этнасу – гутарковая народная мова, што карэннем сваім звязана з глыбокай даўнінай.

Класічныя мастацтва і літаратура гарадской еўрапейскай цывілізацыі запазычваюць вобразы і моўныя формы ў глыбінях фальклору, трансліруючы іх у сучасную эпоху. Такім чынам, у культуры нацыі звычайна здзяйсняецца працэс сінтэзу дыяхрону і сінхрону. Без гэтага няма культурнай спадчыны як цэльнага сацыякультурнага феномена. Аднак міф, мова, фальклор яшчэ не гістарычная свядомасць, а толькі базавы этап яе развіцця. І ў антагенезе, і ў сінхроне яны – свядомасць трансгістарычная, уласцівая народам на пэўных этапах гістарычнага развіцця, і далёка не заўсёды на першасных і прымітыўных. Архетыпічнасць карэннага светапогляду таксама трансгістарычна і ўніверсальна, як і базавыя каштоўнасці месцамі яшчэ нядрэнна захаванага беларускага фальклору. (Вясковы лад жыцця – гарантыя захавання аўтэнтычнага фальклору – на мяжы ХХ–ХХІ ст. імкліва дэфармуецца, і прагназаваць яго далейшы лёс сёння складана, але трэба.) Напэўна, таму вобразны і архетыпічны свет фальклору блізкі і зразумелы дзіцячаму светапогляду, прывабны і цікавы дзіцяці, пакуль маладога чалавека ад іх не пачынаюць адвабліваць спакусы дарослага жыцця, якіх шмат у сучасным індустрыяльным грамадстве.

Глабалізацыя і «выбух камунікацыі» мяжы ХХ–ХХІ ст., дзякуючы якім любая інфармацыя становіцца даступнай для абмеркавання за лічаныя гадзіны «ад Бостана да Будапешта», значна ўскладнілі працэс выхавання асобы. Часам у базавыя архетыпы культуры, якія ўпітвае сучасная ўрбанізаваная моладзь, трапляюць генетычна не ўласцівыя іх продкам архетыпы і каштоўнасці. (Трэба памятаць, што гэтыя працэсы нельга пускаць на самацёк, бо часам новыя каштоўнасці з’яўляюцца не адвольна, а мэтанакіравана – у геапалітычных, не звязаных з народнымі, інтарэсах.) Але адпаведна адной з найвядомых у культуралогіі канцэпцый развіцця грамадства – канцэпцыі Тойнбі – кожны выклік нараджае адказ. Таму мы сёння назіраем у культуры і мастацтве панараму з’яў з этнакаранямі, якія маюць прыстаўкі і канчаткі нью-, пост-, этна- і -фьюжн. А густа «замешаны» на сімбіёзе сацыяльных рухаў, акадэмічных даследаванняў і культурных інавацый фальклорны рух другой паловы ХХ ст. ва Усходняй Еўропе спарадзіў цікавы і неадназначны феномен – п о с т ф а л ь к л о р, большую частку якога складаюць традыцыйна зарыентаваныя на этнічную спадчыну з’явы. Постфальклор – шырокае паняцце, якое ахоплівае гарадскі, карпаратыўны (фальклор медыкаў, археолагаў, студэнтаў), інтэрнэт-фальклор. У артыкуле разглядаецца этнічна арыентаваны постфальклор – сучасная творчасць аматараў нацыянальнай культуры.

Згодна з традыцыяй сацыялагічных і культуралагічных даследаванняў навукоўцаў Прыбалтыкі [6, с. 1] мы адносім да постфальклору дзейнасць сучасных этнічна арыентаваных мастацкіх маладзёжных аб’яднанняў, якія практыкуюць вусныя формы перадачы фальклорных адзінак, кантактуюць з носьбітамі традыцыі, бяруць удзел у абрадавых практыках, захоўваюць этнаграфічны стыль выканання, узбагачаюць фальклорныя стандарты ўласным творчым унёскам [1, с. 13–14]. Месца іх існавання – урбаністычнае асяроддзе ці вёска, але постфальклор – з’ява пераважна ўрбаністычная, гарадская. Сёння Еўропа і Расія вёску амаль страцілі, а Беларусь рэчаіснасць няспынна «ўкручвае ў варонку» аналагічных працэсаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыклады, якія мы можам назіраць у нашых гарадскіх фальклорных аб’яднаннях, сведчаць аб вышэйсказаным вельмі красамоўна. Так, у рамках мінскай прэзентацыі Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» постфальклорныя калектывы стаялі на адной сцэне з вясковымі дзіцячымі гуртамі, на якіх дэфініцыя «постфальклор», вядома, амаль не распаўсюджваецца. Вясковыя ўдзельнікі праекта – гэта дзіцячыя фальклорна-этнаграфічныя ансамблі: жыхары прыроднага вясковага ландшафту, якія шчыльна кантактуюць са старэйшымі носьбітамі фальклорнай аўтэнтыкі. Іх з’яўленне сёння – гэта пераканаўчае сведчанне магчымасці арганічнай сувязі малодшага і сталага пакаленняў носьбітаў традыцыйнай культуры Беларусі, іх мастацкага і маральнага кантакту, перспектывы захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны нашай краіны. Асабліва ўражваюць калектывы «Берагіня», «Верабейкі», «Калыханка» і «Куманёк». Два апошнія ўзніклі ў Доме фальклору вёскі Міханавічы, пад Мінскам у 1989 г.

Міханавічы – вельмі своеасаблівая вёска. Змешчаная «ў арбіце» сталіцы, яна не захавала карэнных фальклорных жанраў, таму кіраўнік мясцовых гуртоў Ларыса Рыжкова пры навучанні выкарыстоўвае аўдыязапісы фальклорных спевакоў, зробленыя навукоўцамі, і перыядычна арганізоўвае сустрэчы сваіх выхаванцаў з аўтэнтычным калектывам вёскі Ананчыцы, што на Салігоршчыне [3, с. 32]. Дзейнасць калектываў – прыклад таго, як ажыццяўляецца сувязь пакаленняў: самых маленькіх прыводзілі бацькі, якія ў 1980-я гг. таксама былі ўдзельнікамі ўзорнага калектыву «Калыханка». Гэта для Беларусі прынцыпова новы феномен: выхаваная прафесійным педагогам у фальклорных традыцыях ва ўмовах сацыякультурнай установы моладзь арганічна і паслядоўна далучае да традыцыі сваіх дзяцей.

Трэба падкрэсліць значэнне асобы Рыжковай як дасведчанага педагога, які атрымаў якасную адукацыю ва ўніверсітэце культуры Санкт-Пецярбурга, мае ўласныя тэарэтычныя напрацоўкі, спалучае тэорыю і практыку фалькларыстыкі, жыве жыццём сваіх выхаванцаў у адваяваным у штодзённасці «фальклорным» часе, які перыядычна выводзіць да эмацыянальна насычанай камунікацыі, разнявольвання, творчых адкрыццяў, самаўдасканалення. Яе калектывы – заўсёдныя госці «Берагіні», фальклорных праектаў замежжа, лаўрэаты фальклорных фэстаў «Пінск – 94», «Беларусь – мая песня», удзельнікі змены этнакультурнага выхавання ў НДЦ «Зубраня», фестывалю «Славянскі базар», фестывалю архаічных спеваў «Найстарэйшыя песні Еўропы» ў Любліне, «Страчаная музыка» ў Кракаве, фальклорных фэстаў у Роўна і Харкаве, удзельнікі першага складу рок-гурту «Ur’ia» (іх галасы гучаць на першым CD калектыву), удзельнікі канцэртаў тэатральнага гурту «Лицедеи», рок-гуртоў Вячаслава Бутусава («Наутилус Помпилиус») і Зміцера Рэвякіна («Калинов мост»). У рэпертуары ансамбля абрадавыя і працоўныя, пазаабрадавыя песні, танцы і гульні Беларусі. У дыскаграфіі калектыву толькі адзін, але вельмі добры дыск «Калыханка» (CD, 2004).

Уключаныя «ў арбіту» мегаполіса, Міханавічы з Домам фальклору Ларысы Рыжковай, сёння, на нашу думку, найяскравы прыклад постфальклору ў Беларусі. Але не адзіны. Падобную дзейнасць праводзяць Сяргей



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выскварка (Цэнтр культуры г.п. Любань), Уладзь Бярбераў (мінская маладзёжная суполка «Ліцвіны»), Таццяна Пладунова (Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці г. Мінска) і шэраг іншых таленавітых і апантаных педагогаў-лідараў. Магчыма, у адрозненне ад постфальклорных суполак Прыбалтыкі, нашыя больш інтэграваныя ў афіцыйныя сацыяльныя інстытуты. Аднак, калі прааналізаваць сістэму грантаў і сацыяльных праектаў, на якую абапіраюцца ў сваёй дзейнасці літоўцы і латышы, невядома, хто больш незалежны ад «правілаў гульні», якія прапаноўвае аматарам фальклору сучасная глабалізаваная рэчаіснасць.

Адзначым, што дыпламанты фестывалю «Берагіня» (з Акцябршчыны, Мётчы, Любані, Міханавіч, Асіповічаў, Мінску), якія прыходзяць вучыцца ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў на спецыялізацыю «этнафоназнаўства» (напрамак «фальклор» спецыяльнасць «народная творчасць»), выхаваныя і арганічныя маладыя людзі, што ў наш час вялікая рэдкасць. Відавочна, ім ад дзяцінства былі прывітыя фрагменты глыбокакарэннага светапогляду, уласцівага носьбітам традыцыі. Выхаваўча-адукацыйны праект «Берагіня» з'явіўся сродкам камунікацыі, абмену вопытам паміж навукоўцамі і педагогамі, якія распрацоўваюць і фальклорна-этнаграфічны і постфальклорны напрамкі этнакультурнага выхавання. Стваральнікі канцэпцыі праекта, неабыякавыя да лёсу краіны і яе народа навукоўцы-фалькларысты Мікалай Козенка, Тамара Варфаламеева і іх калегі, могуць з упэўненасцю засведчыць, што засеянае імі некалі «насенне» дало плённыя парасткі і на абшарах вясковай глебы і на асфальце.

Вялікі патэнцыял духоўнага росту, неабыякавасць да традыцыйных каштоўнасцей з боку «асфальтавай» постфальклорнай моладзі можна было пабачыць і на міжнародна вядомай Страле ў Веткаўскім раёне. Арганізаваная студэнцкай мінскай моладдзю фальклорная вандроўка за 350 кіламетраў на поўдзень – гэта ўжо сам па сабе ўчынак. 13 мая 2010 г. мінскія дзяўчаты, апранутыя ў фальклорныя касцюмы, сталі ў адзін карагод з генетычна таленавітымі спявачкамі Неглюбкі і Стаўбуна і «далі стрэльны гук». Над песнямі Стралы вёсак Неглюбка і Стаўбун з Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці ў 2010 г. са студэнтамі ў Мінску працавалі выкладчыкі кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Таццяна Пладунова, Наталля Петухова і Ларыса Рыжкова.

Уразіла этычнасць мінскай моладзі ў адносінах да культуры продкаў. Сапраўды, калі культура мае патэнцыял «уцягваць у сваю арбіту» новыя пакаленні, а моладзь да гэтага імкнецца – яшчэ не ўсё згублена, трэба толькі ахоўваць і не перашкаджаць, і лінія духоўнасці і традыцыі будзе падоўжана.

Сёння ў фестывальных і адукацыйных праектах этнакультурнага выхавання працэс навучання пачынаецца з побытавага танца і гульні як найдэмакратычных фальклорных жанраў. Значэнне этнічна афарбаваных рухаў, традыцыйнай харэаграфіі, актуалізаванае Мікалаем Козенкам і яго калегамі, нельга недаацэньваць. Адзін з заснавальнікаў эмпірызму ў філасофіі Джон Лок, на якога спасылалася большасць агульнавядомых філосафаў-асветнікаў, у «Думках аб выхаванні» казаў: «Здаровы дух у здаровым целе –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэта вельмі кароткая, але ёмістая формула шчасця на гэтым свеце» [5, с. 251]. Мы ўпэўнены, што ў фальклорных аб'яднаннях, якія існуюць і на вёсцы, і «на асфальце», дзеці маюць і першае, і другое, бо ў працэсе дзейнасці такіх гуртоў актуалізуюцца традыцыйныя нормы паводзін, згодна з якімі, напрыклад, палова часу на беларускім вяселлі адводзілася на «актыўныя, безупынныя танцы» [2, с. 33]. Не дзіва, што ў працэсе знаёмства са скарбамі народнага мастацтва асобы, «уцягнутыя ў арбіту» этнакультурнага выхавання, шмат рухаюцца – гуляюць і танцуюць, але адначасова выхоўваюць свае пачуцці, этыку ўзаемаадносін, густ.

Такім чынам, можна канстатаваць, што постфальклорны шлях для беларускай светапогляднай парадыгмы – шлях выхавання ў перспектыве годных, развітых, патрыятычна арыентаваных маладых людзей. Асабліва гэта актуальна для сучаснага горада, які імкліва губляе сувязь з этнічнымі каранямі сваіх жыхароў. Французскія асветнікі казалі: «L'homme est tout éducation» (Чалавек цалкам залежыць ад выхавання). Сапраўды, выхаваныя ў фальклорных аб'яднаннях адрозніваюцца і відавочна ў лепшы бок ад тых, хто выхоўваецца без традыцый, толькі «асфальтавай» вуліцай, школьнай казёншчынай і Інтэрнэтам. На жаль, колькасць апошніх будзе павялічвацца. Таму задача фарміравання светапогляду сродкамі постфальклору – адна з найбольш актуальных для тэарэтыкаў культуры і адукацыі, філосафаў, педагогаў і выхавацеляў у XXI ст.

1. *Дарашэвіч, Энгельс.* Постфальклор : да пытання вывучэння генезісу і футуралагічных інтэнцый / Энгельс Дарашэвіч // Аўтэнтычны фальклор : праблемы вывучэння, захавання, пераймання : зб. навук. прац удзельнікаў IV Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29–30 крас. 2010 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2010. – С. 12–15.

2. *Козенка, М.* Традыцыйнае вяселле Мядоцкага краю / М. Козенка, А. Абрамовіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2005. – 304 с.

3. *Рыжкова, Ларыса.* Вопыт супрацоўніцтва ўзорнага ансамбля «Калыханка» з фальклорна-этнаграфічным калектывам вёскі Ананчыцы / Ларыса Рыжкова // Аўтэнтычны фальклор : праблемы вывучэння, захавання, пераймання : зб. навук. прац удзельнікаў III Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29–30 крас. 2009 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2009. – С. 32–34.

4. *Энцыклапедыя* гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. В. Біч [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 2003. – Т. 1 : А – Беліца. – 1993. – 494 с.

5. *Libera, Zdzisław.* Oświecenie / Zdzisław Libera. – Warszawa : Wydawnictwa szkolne i pedagogiczne, 1974. – 550 s.

6. Mėnuo Juodaragis : XIII nepriklausomas post-folk alternative muzikos ir šiuolaikinės baltų kultūros festivalis. – Vilnius : MJR, 2010. – 9 p.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*E. DARASHEVICH*

**USING FOLKLORE IN THE FORMATION OF WORDL OUTLOOK OF THE SUBJECT OF CULTURE**

*Nowadays cultural theorists while forming the educational model of a country emphasize the necessity of its connection with traditional national culture. The author pays attention to the importance of folklore in bringing up a harmonious person.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ